*Святлана Пацыенка*

# МІРСКІ ЗАМАК ЯК УВАСАБЛЕННЕ ГАРМОНІІ ВАЕННАГА І АБАРОНЧАГА ПАЧАТКАЎ У КУЛЬТУРЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

Гісторыя сведчыць аб тым, што ў шматлікіх галінах чалавечай дзейнасці рухавіком прагрэсу выступалі войны. Гэтым пастаянным «спадарожніцам» чалавецтва прысвячалася праца мільёнаў геніяў: таленавітых ваяроў, інжынераў, гісторыкаў, паэтаў і дойлідаў. Менавіта апошнія стваралі знешні выгляд вайны, які ў велічных руінах былых цытадэляў мы бачым і цяпер. Дзякуючы працы старажытных дойлідаў, сёння можна ўбачыць наш край такім, якім ён выглядаў шмат стагоддзяў таму, бо, як кажуць навукоўцы, «успрымаючы архітэктуру мінулага, чалавек, дзякуючы генетычнаму бачанню, свядома ці падсвядома ўключаецца ў тую гістарычную эпоху, у якой яна была створана» [4, с. 133].

Узнікненне Мірскага замка прыпала на 1-ю палову XVI ст. У гэты час у Вялікім княстве Літоўскім паступова спынілася будаўніцтва дзяржаўных замкаў, і на змену фартэцыям стратэгічнага значэння прыйшлі больш свецкія прыватнаўласніцкія пабудовы. Мірскі замак, напрыклад, будаваўся як рэзідэнцыя маршалка дворнага і ваяводы берасцейскага Юрыя Ілініча. З'яўленне прыватнаўласніцкіх замкаў стала магчымым з-за ўзмацніўшагася эканамічнага становішча беларускіх магнатаў і парушыла вялікакняжацкую манаполію на будаўніцтва замкаў. Замак зрабіўся ўвасабленнем не толькі дзяржаўнай магутнасці, але моцы і велічы свайго ўладара.

Што ж вымушала беларускіх магнатаў узводзіць магутныя мураваныя пабудовы ў сваіх уладаннях? Вядомы гісторык архітэктуры М. А. Ткачоў лічыў, што галоўнай прычынай развіцця замкавага будаўніцтва у 2-й палове XV — пачатку XVIII стст. было нестабільнае становішча ў палітычным і рэлігійным жыцці краіны: «Феадальныя звады і міжусобіцы, вострая рэлігійная барацьба перыяду Рэфармацыі і Контррэфармацыі стымулявалі энергічнае будаўніцтва прыватнаўласніцкіх замкаў, за



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

магутнымі сценамі якіх феадалы шукалі надзейнага паратунку» [6, с. 56]. Сапраўды, бесперапынныя спрэчкі магнатаў прыводзілі да таго, што нярэдка ў якасці ворага выступаў сваяк ці бліжэйшы сусед. Акрамя таго, геапалітычнае становішча Вялікага княства Літоўскага па-ранейшаму вымушала насельніцтва краіны пастаянна знаходзіцца ў стане гатоўнасці да вайны. У такіх умовах багаты чалавек, якому было што губляць, імкнуўся засцерагчы сябе і сваіх блізкіх ад варожых праяў знешняга свету.

Уладзіслаў Сыракомля ў «Вандроўках па маіх былых ваколіцах» (1853) выказваў іншую думку наконт мэты ўзвядзення прыватнаўласніцкага замка ў Міры. Адразу адзначым, што будаўніцтва замка па гэтай версіі Сыракомля прыпісваў Юрыю Іллінічу — унуку таго маршалка дворнага Юрыя Ілініча, які сёння лічыцца заснавальнікам замка. Адмаўляючы перавагу абарончай функцыі, паэт пісаў, што «проста ганарыстаму Іллінічу ці яго апекуну Мікалаю Радзівілу Чорнаму хацелася, каб Ілініч займеў тытул валадара замка Святой Рымскай Дзяржавы і пісаўся «граф мірскі», а такі тытул прысвойвалі нямецкія імператары толькі ўладальнікам замкаў» [5, с. 32]. Адзначым, што 10 ліпеня 1553 года (па іншых звестках 1555 г.) Юрый Ілініч атрымаў тытул графа Рымскай імперыі ў Міры.

Меркаванне У. Сыракомлі прытрымліваецца архітэктар В. В. Калнін, які таксама лічыць верагодным пабудову замка Юрыем Іллінічам (але ўжо дзедам) з мэтай атрымання княжацкага тытула. Даследчык падмацоўвае сваю думку, звяртаючы ўвагу на шматлікія хібы і нязручнасці абарончай функцыі замка, а таксама на высокі ўзровень яго дэкаратыўнасці.

Як бачым, першая гіпотэза акцэнтуе ўвагу на дамініраванні *абарончай* функцыі ў архітэктуры Мірскага замка, а другая — *прадстаўнічай.* На наш погляд, больш правільным было б не супрацьпастаўляць гэтыя дзве функцыі, а разглядаць іх як узаемадапаўняючыя адна адну. Асабліва гэта датычыцца будынка пачатку XVI ст. Як нам прадстаўляецца, Мірскі замак уяўляе сабой пабудову, якая выразна дэманструе пераход у абарончым дойлідстве ад чыста функцыянальнага вайсковага будаўніцтва да свецкага прадстаўнічага жылля. Можна пагадзіцца з мастацтвазнаўцам Міколам Шчакаціхіным, які пісаў, што Мірскі замак «можа лічыцца за канчатковае завяршэнне тых асноўных замкавых тыпаў беларуска-літоўскай архітэктуры, якія намячаліся яшчэ ў Крэве, Лідзе


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і Троках» [7, с. 202]. Аднак варта дадаць, што замак у Міры стаў не толькі заключным этапам ранейшага агульнадзяржаўнага замкавага будаўніцтва, але і першым крокам на шляху развіцця новага прыватнаўласніцкага дойлідства.

З XVI ст. архітэктурнае вырашэнне прыватнаўласніцкіх замкаў становіцца значна разнастайней. Дастаткова прыгадаць абрысы Геранёнскага (пачатак XVI ст.), Нясвіжскага (канец XVI ст.) ці Гальшанскага (1-я палова XVII ст.) замкаў, каб адчуць усё багацце і непадобнасць архітэктурных форм прыватнаўласніцкага будаўніцтва. Магнаты сустракалі прататыпы для сваіх рэзідэнцый не толькі і не столькі ў Вялікім княстве Літоўскім, колькі ў архітэктуры Італіі, Галандыі і іншых еўрапейскіх краін. Што да Мірскага замка, то В. В. Калнін дапускае, што яго архітэктурнае вырашэнне магло сфарміравацца пад уплывам малдаўскай архітэктуры [3, с. 47]. Верагоднай падставай для гэтага даследчык лічыць малдаўскі паход войска Вялікага княства Літоўскага супраць туркаў у канцы XV ст., у якім прымаў удзел Юрый Іллініч. Магчыма, выгляд тамтэйшых замкаў пэўным чынам паўплываў на дэкаратыўнае вырашэнне Мірскай рэзідэнцыі.

Такім чынам, архітэктура рэзідэнцый адлюстроўвала не толькі агульнамастацкія тэндэнцыі, але і ўласныя прыхільнасці магнатаў. На XVI — XVII стст. прыпаў пік праяўлення індывідуальнасці ў замкавай архітэктуры. Знешні і ўнутраны дэкор пабудовы, планіроўка і прызначэнне прасторы павінны былі цалкам адпавядаць густам гаспадара. Прыватнаўласніцкія замкі зрабіліся ўвасабленнем індывідуальнасці арыстакрата. Гэта былі адзінкавыя пабудовы, за кожнай з якіх стаяла канкрэтная гістарычная асоба.

Замак прадстаўляў сабой своеасаблівы мураваны партрэт свайго ўладальніка. Так, Мірскі замак аднachасова з'яўляўся свецкай рэпрэзентатыўнай пабудовай, выкананай у лепшых традыцыях прыватнаўласніцкага будаўніцтва, і ўмацаваным жыллём феадала, якое яшчэ не страціла добрыя абарончыя якасці (пяць вежаў — самастойных вузлоў абароны, магутныя сцены, высокія земляныя валы і г.д.). Гэта двaістасць выдатна характарызавала ўладальніка замка. Юрый Іллініч з'яўляўся свецкай прыдворнай асобай і займаў прэстыжную пасаду маршалка дворнага. Разам з тым, ён быў воінам, які прымаў актыўны ўдзел у разнастайных ваенных дзеяннях.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падобным чынам у XVI — 1-й палове XVII ст. своеасаблівая дваістасць, паралельнасць суіснавання ваенна-абарончага і свецкага пачаткаў мела месца ў культуры вышэйшага саслоўя беларускага грамадства. З аднаго боку, большасць з арыстакратаў служылі ў войску. Вайна лічылася пачэсным і ганаровым заняткам, таму магнаты валодалі навыкамі добрых ваяроў. У такіх умовах значную ролю адыгрываў культ зброі, якая выступала абавязковым атрыбутам прадстаўніка вышэйшага саслоўя.

З іншага боку, у гэты час у грамадстве ўзрасло імкненне да рэпрэзентатыўнасці. Значны ўплыў на свядомасць прадстаўнікоў арыстакратыі беларускага грамадства аказала эстэтыка Адраджэння. У XVI ст. актыўна пашырылася практыка паездак за мяжу (асабліва ў краіны Заходняй Еўропы), дзе жыхары Вялікага княства Літоўскага знаёміліся з лепшымі дасягненнямі ва ўсіх галінах чалавечай дзейнасці. Акрамя таго шлюб караля і вялікага князя Жыгімонта I з італьянкай Бонай Сфорца (1518) паспрыяў непасрэднаму пранікненню ў Вялікае княства Літоўскае ўплываў еўрапейскай рэнесанснай культуры, а таксама знаёмству літоўскай арыстакратыі з умовамі свецкага жыцця Еўропы.

На змену вайсковай арыентацыі культуры вышэйшага саслоўя наступова пачала прыходзіць свецкая. Заняўшы ў папярэднія часы адпаведныя амбіцыям і імпэту пасады, зрабіўшы кар'еру, маючы задавальняючае становішча ў грамадстве, ужо менш цікавячыся вайной, магнаты скіравалі ўвагу на ўласную асобу і добраўпарадкаванне навакольнага асяроддзя.

Новая эпоха прынесла новыя адносіны да замка: з ваенна-абарончага пункта ён пачаў ператварацца ў прыгожае і камфортнае жыллё. Увага пачала звяртацца на ўзровень паўсядзённага жыцця арыстакратыі, на якасць і камфортнасць побыту, на прыгажосць і эстэтычную значнасць жылля, адзення, ежы і іншых рэчаў. Жыццё прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя стала больш спакойным, мірным, а таму сваю дзейнасць яны скіравалі на свецкія справы. Арыстакраты задумаліся аб удасканаленні гаспадаркі ў сваіх латыфундыях, аб спосабах атрымання грашовых сродкаў, якіх патрабаваў новы свецкі лад жыцця. Думкі найбольш заможных магнатаў пачаў займаць клопат аб уласнай «дзяржаве», узроўні яе прадстаўнічасці.

Узгаданыя вышэй змены закранулі і Мірскі замак. Гэта адбылося прыкладна ў 1580-я гады, калі новы ўладальнік Міра,

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ



Інв. № 355 828

князь Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка, праводзіў перабудову Мірскага комплексу. У выніку гэтага на тэрыторыі замкавага двара ўзнік будынак палаца. Жыллё князёў адрознівалася багаццем і большым камфортам у параўнанні з астатнімі замкавымі памяшканнямі. Княжацкія пакоі мелі высокія столі і ўяўлялі сабой прасторныя залы з вялікімі вокнамі. Вокны былі зашклёныя, аб чым сведчаць знаходкі аконнага шкла. Прычым, акрамя звычайнага шкла, тут знойдзены нават фрагмент распіснога танкасценнага вітража, магчыма, венецыянскай работы [2, с. 65]. Сярод пакояў палаца, якіх было больш за сорак, — спальні і кабінеты князёў, сталовая, вялікія залы для ўрачыстасцей і прыёму гасцей: збройныя, партрэтныя, танцавальная і більярдная залы. У пакоях было шмат скульптур, карцін, габеленаў і іншых твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У выніку перабудовы Мірскі замак, не адмаўляючыся ад сваёй першапачатковай функцыі абарончага пункта, паступова ператварыўся ў прадстаўнічую свецкую пабудову.

Такім чынам, XVI — 1-я пал. XVII ст. для Вялікага княства Літоўскага сталі часам гарманічнага яднання праяў ваеннага і свецкага пачаткаў. Гэта адлюстравалася як у матэрыяльнай, так і ў духоўнай культуры беларускага грамадства. Як нам прадстаўляецца, менавіта Мірскі замак, у якім надзвычай удала спалучыліся абарончая і прадстаўнічая функцыі, стаў архітэктурным увасабленнем гэтай гармоніі ў абарончым дойлідстве Вялікага княства Літоўскага.

*Літаратура*

1. Археалогія Беларусі: У 4 т. Т.4: Помнікі XIV — XVIII стст. / Рэд. тома В. М. Ляўко і інш. Мн., 2001. 597 с.
2. Здановіч Н. І., Краўцэвіч А. К., Трусаў А. А. Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка. Мн., 1994. 152 с.
3. Калнін В. В. Мірскі замак. Мн., 2002. 160 с.
4. Середюк И. И. Восприятие архитектурной среды. Львов, 1979. 202 с.
5. Сыракомля У. Вандроўкі па маіх былых ваколіцах: Успаміны, даследаванні гісторыі і звычаяў. Мн., 1992. 159 с.
6. Ткачоў М. А. Замкі Беларусі. Мн., 1977. 83 с.
7. Шчакаціхін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Мн., 1993. 329 с.
8. Mikulski W., Zawadzki J. Opisy zamków białoruskich z inwentarzy dóbr przechowyanych w archiwum Radziwiłłów w archiwum głównym akt dawnych. Warszawa: Wspólne dziedzictwo, 1999. 88 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ